Источник: "Наша слова" - 2017-11-22

# Навуковая канферэнцыя "Каласавіны"




**2 лістапада 2017 года** міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Дзяржаўным літаратурна - мемарыяльным музеем Якуба Коласа правялі XXXI міжнародную навуковую канферэнцыю "Каласавіны", прысвечаную 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Мерапрыемства распачалося з урачыстага гашэння паштовай маркі.

Перад прысутнымі з прывітальным словам выступіў доктар тэхнічных навук, прафесар, сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч. Свой даклад зрабіла і сакратар літаратурна-мемарыяльнага музея Анастасіі і Марыі Цвятаевых (г. Аляксандраў) Эльвіра Барысаўна Калашнікава.

Пленарным паседжаннем кіраваў член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Лукашанец Аляксандр Аляксандравіч. У Працы секцый прынялі ўдзел 45 чалавек. Мне асабіста спадабаліся даклады Маргарыты Юр'еўны Латышкевіч "Якуб Колас і перакладчыцкая дзейнасць часопіса "Маладосць" ", а таксама Алесі Іванаўны Шамякінай, якая працуе старшым навуковым супрацоўнікам аддзела выданняў і тэксталогіі філіяла "Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы" ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі". Яе даклад меў назву: "Апавяданні Якуба Коласа першай паловы 1920-х гадоў". Адбылася цікавая дыскусія. Было зададзена шмат пытанняў.

**3 лістапада 2017 года** ў малой зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся двухгадзінны святочны канцэрт "Спяшайцеся з паэтам стрэцца...". Гледачы дзве гадзіны сустракалі апладысментамі музыкаў і артыстаў. Публіка з захапленнем слухала спевы народнай артысткі Рэспублікі Беларусь Таццяны Мархель і маладых артыстаў! У зале прысутнічалі беларускія пісьменнікі Анатоль Бутэвіч, Уладзімір Мазго, Яўген Хвалей, Алесь Камароўскі, Мікола Маляўка, Міхась Пазнякоў, Уладзімір Навумовіч, а таксама кіраўнікі ўстаноў культуры сталіцы. Было цікава. Потым прысутныя ўсклалі кветкі да помніка Якубу Коласу!

***Аляксей Шалахоўскі.***

Аляксей Шалахоўскі. Навуковая канферэнцыя "Каласавіны"